XVII Звычайная нядзеля

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
25.07.2021 00:00



Ян 6, 1–15 Езус адышоў на другі бок Галілейскага, або Тэберыядскага, мора. Ішло за Ім мноства людзей, таму што бачылі цуды, якія Ён чыніў над хворымі. Езус узышоў на гару і сядзеў там са сваімі вучнямі. А набліжалася Пасха, юдэйскае свята. Калі Езус узняў вочы і ўбачыў, што мноства людзей ідзе да Яго, сказаў Філіпу: “Дзе нам купіць хлеба, каб накарміць іх?”. А казаў гэта, выпрабоўваючы яго, бо сам ведаў, што збіраўся рабіць. Філіп адказаў Яму: “Хлеба на дзвесце дынараў не хопіць, каб кожнаму дасталася хоць крыху”. Адзін з вучняў Ягоных, Андрэй, брат Сымона Пятра, кажа Яму: “Ёсць тут адзін хлопец, які мае пяць ячменных хлябоў і дзве рыбы, але што гэта для такога мноства?”. Езус сказаў: “Загадайце ім сесці”. А было на тым месцы шмат травы. І селі людзі, якіх было каля пяці тысяч. Езус узяў хлябы і, падзякаваўшы, раздаў тым, хто сядзеў; таксама і рыбы, колькі хто хацеў. А калі насыціліся, сказаў вучням сваім: “Збярыце кавалкі, што засталіся, каб нічога не змарнавалася”. Сабралі і напоўнілі дванаццаць кашоў кавалкамі з пяці ячменных хлябоў, якія засталіся пасля тых, хто еў. Калі ж людзі ўбачылі, які цуд учыніў Езус, казалі: “Ён сапраўды прарок, які мае прыйсці на свет”. Калі Езус даведаўся, што хочуць прыйсці і схапіць Яго, каб зрабіць каралём, зноў адышоў на гару адзін.
†

Не змарнаваць ласку

Езус паказвае нам, наколькі блізкі Яму чалавек. Цуд памнажэння хлеба, які Ён здзяйсняе, – гэта адкрыццё Яго ласкі да людзей. Яго любоў не мае межаў. Фрагмент гэтага Евангелля прапануе нам паразважаць над тым, што Езус зрабіў для нас, чым нас адарыў і што надалей дае. А дае Ён нам сябе.

Ганс Урс фон Бальтасар пісаў, што Езус дзейнічае, як бесклапотны марнатравец, але ў той жа час не дазваляе, каб штосьці змарнавалася. Загадвае сабраць рэшткі, каб вучні і Касцёл мелі запас ежы для ўсіх, хто мае патрэбу. Мы не можам змарнаваць дар, які атрымліваем ад Бога. Не можам змарнаваць дабро і любоў.

Пане Езу Хрысце, навучы мяне дзяліцца з іншымі тым, што атрымліваю ад Цябе.